# ЮБІЛЯРЫ

# факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый

У студзені 2007 г. сябры і калегі святкавалі юбілей вядомага ўсёй бібліятэчнай грамадскасці прафесіянала і выдатнага арганізатара бібліятэчнай адукацыі краіны – прафесара, кандыдата педагагічных навук **РОВІНАЙ РАІСЫ АЎРАМАЎНЫ.**

Раіса Аўрамаўна прыйшла ў бібліятэчную справу ў 1960-х гадах. Пасля заканчэння бібліятэчнага факультэта Мінскага педінстытута імя М. Горкага працавала ў аддзеле тэхнічнай інфармацыі. Паспяхова абараніўшы кандыдацкую дысертацыю ў Маскоўскім дзяржаўным інстытуце культуры, яна вярнулася ў родную ВНУ ў якасці асістэнта кафедры бібліяграфіі. Тут Р.А. Ровіна прайшла ўсе этапы педагагічнай дзейнасці, працавала спачатку выкладчыкам, затым старшым выкладчыкам, дацэнтам. З адкрыццём Мінскага інстытута культуры Раіса Аўрамаўна стала загадчыцай кафедры тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі. З мэтай удасканалення падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў у розныя гады ёю былі распрацаваны такія вучэбныя курсы, як «Гісторыя тэхнічнай кнігі», «Патэнтная і нарматыўна-тэхнічная дакументацыя», «Бібліяграфія прыродазнаўчай, тэхнічнай, сельскагаспадарчай, медыцынскай літаратуры» і іншыя. Асаблівую ўвагу Раіса Аўрамаўна надавала станаўленню і развіццю спецыялізацыі «наувукова-тэхнічныя бібліятэкі». Яе намаганнямі на кафедры тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі быў створаны унікальны калектыў аднадумцаў-прафесіяналаў, які складаўся з вядучых выкладчыкаў інстытута, практыкаў бібліятэчнай справы і выкладчыкаў, запрошаных з іншых рэгіёнаў краіны.

Выдатныя арганізатарскія якасці Раісы Аўрамаўны ў поўнай меры рэалізаваліся на бібліятэчным факультэце, дзе больш дзесяці год яна была дэканам. Тут па-новаму праявіліся яе здольнасці аналізаваць тэндэнцыі і бачыць перспектыву, умець арганізаваць падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў па неабходных бібліятэчнай практыцы спецыялізацыях. Для падрыхтоўкі бібліятэкараў у гэты перыяд былі характэрны грунтоўнасць, прафесіяналізм, спалучэнне навацый і традыцый.

Назапашаныя прафесійныя веды і вопыт дазволілі Раісе Аўрамаўне ўзначаліць вучэбны аддзел універсітэта культуры і мастацтваў. Зараз на яе рабочым стале стандарты вышэйшай прафесійнай адукацыі па ўсіх спецыяльнасцях універсітэта, вучэбныя планы, расклады заняткаў.

Раіса Аўрамаўна заўсёды верная сабе. На ўсіх пасадах працуе самааддана, не выбірае лёгкіх шляхоў, яна патрабавальная да сябе і тых, хто побач. Ёй уласцівы прафесійная кампетэнтнасць, высокая працаздольнасць, арганізаванасць. Уважлівая і добразычлівая, яна заўсёды гатова аказаць кваліфікаваную дапамогу і падтрымку. Раіса Аўрамаўна з'яўляецца добрым сябрам і калегай для многіх пакаленняў выпускнікоў факультэта.

За дасягненні ў арганізатарскай і педагагічнай дзейнасці Раіса Аўрамаўна неаднаразова ўзнагароджана ганаровымі граматамі Міністэрства культуры, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Дацэнт кафедры інфармацыйных рэсурсаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў, кандыдат тэхнічных навук **БАРЫС ВАСІЛЬЕВІЧ ПЯТРЭНКА** нарадзіўся ў 1936 г. у Кіеўскай вобласці.

Пасля заканчэння энергетычнага тэхнікума Барыс Васільевіч пачаў свой працоўны шлях на Дабратворскай ГРЭС. Школай мужчынскага і чалавечага сталення стала для Б.В. Пятрэнкі служба ў Ваенна-Марскім Флоце.

У 1960 г. лёс прывёў Барыса Васільевіча на Беларусь. Спачатку ён працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела аўтаматызацыі і механізацыі Беларускага НДІ харчовай прамысловасці. З 1964 г. ён супрацоўнік вядучай навуковай установы рэспублікі ў галіне навукова-тэхнічнай інфармацыі – Беларускага навукова-даследчага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі і тэхніка-эканамічных даследаванняў. Працуючы, у 1976 г. заканчвае Беларускі політэхнічны інстытут.

Захопленасць праблемамі арганізацыі навукова-тэхнічнай інфармацыі прыводзіць Барыса Васільевіча ў аспірантуру Усесаюзнага інстытута навуковай і тэхнічнай інфармацыі, дзе ён паспяхова абараняе кандыдацкую дысертацыю, звязаную з распрацоўкай прынцыпаў кіравання дакументальнымі інфармацыйнымі патокамі.

Спецыяліст высокай навуковай кваліфікацыі, Б.В. Пятрэнка прайшоў шлях ад загадчыка аддзела да намесніка дырэктара БелНДІНТІ, затым узначаліў аддзел Упраўлення па навуцы і тэхніцы Дзяржплана БССР.

Вопыт навуковай і арганізацыйнай дзейнасці Б.В. - Пятрэнкі ў 1983 г. быў запатрабаваны ў сістэме вышэйшай бібліятэчнай адукацыі. Барыс Васільевіч узначаліў кафедру тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі, затым інфарматыкі і тэхнічных сродкаў.

Б.В. Пятрэнка – адзін з аўтараў першага ў Беларусі падручніка па курсу «Інфарматыка» для студэнтаў інстытутаў культуры і педагагічных ВНУ. Ім распрацаваны курсы лекцый «Тэхнічныя сродкі бібліятэчнай працы», «Інфармацыйны маніторынг» і інш.

Сярод апублікаваных Барысам Васільевічам прац – аўтарскія даследаванні, навуковыя артыкулы, даклады на навуковых канферэнцыях, вучэбна-метадычныя выданні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Б.В. Пятрэнка – уважлівы да студэнтаў, справядлівы выкладчык, добразычлівы калега, надзейны сябра, вытрыманы, сціплы і мудры чалавек. Яго дасягненні ў прафесійнай, навуковай і педагагічнай дзейнасці адзначаны двума сярэбранымі медалямі ВДНГ СССР, ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, іншымі ўзнагародамі.

**Калектыў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый віншуе Раісу Аўрамаўну Ровіну і Барыса Васільевіча Пятрэнку з юбілеямі і жадае добрага здароўя, плёну ў працы, дабрабыту і радасці ў жыцці.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ